УДК 94 (476)

***В. В. Панежа***

# СТРАЧАНАЯ СПАДЧЫНА МАГІЛЁЎШЧЫНЫ

**Анатацыя.** Разглядаюцца пытанні неабходнасці захавання архітэктурных помнікаў Магілёўшчыны як важнай часткі матэрыяльнай і духоўнай спадчыны беларускага народа.
**Ключавыя словы**: архітэктурны помнік, гістарычная памяць, духоўная спадчына, нацыянальная культура, нацыянальная святыня, грамадства.

Зямля Магілёўшчыны па праву можа ганарыцца не толькі багатай і цікавай гісторыяй, але і надзвычай багатай архітэктурнай спадчынай. Зразумела, што архітэктура па сваёй сутнасці з’яўляецца ўвасабленнем гісторыі грамадства. У адрозненне ад іншых каштоўнасцей нацыянальнай культуры архітэктурныя помнікі нельга адарваць ад match роднай зямлі, вывезці ў іншае месца, схаваць ад людскога вока [3]. Архітэктурны помнік можна толькі зруйнаваць, знішчыць, не пакінуўшы нават слядоў, і тым самым збядніць гістарычную памяць народа. Менавіта гэта знішчэнне адбывалася на беларускай зямлі на працягу многіх стагоддзяў. Падчас войнаў руйнаваліся не толькі гарады і вёскі, гінулі шматлікія, унікальныя па сваёй сутнасці помнікі нацыянальнай культуры і дойлідства.

Але не толькі войны нанеслі непамерныя страты архітэктурнай спадчыне беларускага народа. Знішчэнне нацыянальных святынь працягваецца і ў наш час. Многія з іх знаходзяцца ў напаўразбураным стане. Прычын таму шмат: прафесійная некампетэнтнасць, злачынная безгаспадарнасць, бездухоўны прагматызм, эканамічныя праблемы і г. д.

У артыкуле гаворка пойдзе пра архітэктурныя помнікі, якія напаткаў трагічны лёс, помнікі, што знаходзяцца на нашай Магілёўшчыне, побач з намі.

Кіламетраў за 20 на поўдзень па шашы Магілёў – Гомель раскінулася вёска Сідаравічы, якая вядома з 1560 г. з часоў Вялікага княства Літоўскага. Назва вёскі ўпамінаецца таксама і ў Баркалабаўскай хроніцы ў 1607 г. У 1848 г. тут налічвалася 62 двары, размяшчаліся маёнтак памешчыка, млын, драўляная царква, карчма, паштовая станцыя, якая мела 16 коней. Пазней была пабудавана мураваная царква. З помнікаў архітэктуры тых даўніх часоў засталіся толькі паштовая станцыя (будынак сярэдзіны XIX ст.) і мураваная Мікалаеўская царква. Стан будынка царквы на сёняшні дзень даволі гаротны.

Першыя звесткі аб царкве былі знойдзены ў дакументах Баркалабаўскага манастыра. Вядома, што будаўніцтва мураванай царквы ў Сідаравічах было пачата ў 1861 г. і закончана ў 1865 г. Асноўная частка будыніны мае форму роўнавялікага васьміграінніка, утвараючага ўверсе купал. Такая форма пабудовы даволі рэдкая, і ў наш час амаль нідзе не сустракаецца. Як адзінае цэлае да будыніны з усходу прымыкае алтар, які мае кубічную форму – біблейскі сімвал

«Сусветнасці». З захаду ідзе выцягнутая ў даўжыню прамавугольная прыбудова, якая служыць асновай двух'яруснай званіцы. Адначасова гэта прыбудова ўтварае партал цэнтральнага ўваходу. Маюцца і два бакавыя ўваходныя парталы. Царква асвятлялася 12 паўцыркульнымі вокнамі. Унутранае ўбранне храма не захавалася [1, с. 101]. Сёння ўсё менш застаецца тых, хто памятае, наколькі маляўнічым было месца вакол царквы, ды і сама царква, нягледзячы на свае невялікія памеры, мела прыгожы выгляд. У свой час старыя жыхары вёскі расказвалі, што іканастас складаўся з многіх, даволі каштоўных ікон. Найбольшае ўражанне пакідалі дзве вялікія з залатым акладам іконы Хрыста і Багамацеры.





Мікалаеўская царква і фрэскі на купале, вёска Сідаравічы Магілёўскага раёна (фота аўтара)

На купале, які абазначае «твердь небесную» (зямлю і неба), да сённяшняга дня захаваліся фрэскі з абразамі Усявышняга, лікам анёлаў і святых. Час не змог знішчыць створанае ўмелымі рукамі сапраўднага майстра. Калі добра прыгледзіцца, на заходняй сцяне можна разабраць напісаную карціну Страшнага Суда, які сведчыць аб веры, аб жыцці, пранізаным яго святлом, будзіць заснуўшае сумленне сучаснікаў.

Але пакінем на нейкі момант сучаснасць і звернемся зноў да мінулага. У 1929 г. царкву закрылі, царкоўныя землі адышлі пад калгас. Трагічным стаў і лёс свяшчэнніка царквы Мікалая Аляксандравіча Наўроцкага. Яго абвінавацілі ў антысавецкай дзейнасці, арыштавалі і асудзілі. Наўроцкі трапіў на будаўніцтва Беламора-Балтыйскага канала. Пасля вяртання ў Беларусь каля года пражыў у дачкі. Нікуды не хадзіў, ні з кім не размаўляў. Людзі празвалі яго «блазнаватым». А за некалькі хвілін да смерці вымавіў: «Жыў як на востраве, акружаным пустатой. Усё жыццё я маліўся богу, і ўсё жыццё д'ябал звязваў мяне па руках і нагах» [1, с. 100].

У пасляваенныя гады магутнымі трактарамі, што працуюць на балотах, спрабавалі разбурыць будыніну царквы, але з гэтай ідэі нічога не атрымалася. Царква засталася стаяць. А пасля таго, як згарэў у вёсцы калгасны млын, царкву прыстасавалі пад яго.

Пытанне аб аднаўленні царквы ў Сідаравічах узнікала неаднойчы. Многія прасілі аб гэтым. У канцы 60-х гг. у Сідаравічы з Масквы прыязджаў доктар геолага-мінералагічных навук прафесар Фёдар Іосіфавіч Вальфсон (1907–1989), які нарадзіўся ў гэтай вёсцы. Убачыўшы разваліны і запусценне, Фёдар Іосіфавіч напісаў у Савет Міністраў Беларусі некалькі пісем з просьбай аднавіць Сідаравіцкую царкву як гістарычны помнік архітэктуры. Пасля гэтага будынак царквы агледзелі спецыялісты ўпраўлення рэстаўрацыі. Яны прапанавалі калгасу «Расія» выдзеліць на рэстаўрацыю гістарычнай каштоўнасці 225 тыс. р. (на той час). Калгас даў згоду. Аднак бурныя працэсы пагаршэння эканамічнага становішча калгаса з аднаго боку, цяжкасці з будаўнічымі матэрыяламі з другога боку перакрэслілі гэтыя планы (запісана з успамінаў І. Гуркова, загадчыка гісторыка-краязнаўчага музея калгаса «Расія», в. Сідаравічы).

У 1993 г. у газеце «Прыдняпроўская ніва» быў надрукаваны артыкул «І глядзяць анёлы з купалаў ...» (аўтар І. Гуркоў, загадчык гісторыка-краязнаўчага музея калгаса «Расія»). Пасля выхаду артыкула млын у царкве закрылі. А царква засталася стаяць, нават у такім закінутым выглядзе, усе яшчэ высокая, прасторная, прыгожая, хоць уяўляла сабой адны разваліны і запусценне. Што і казаць, умелі будаваць нашы продкі. З часам на даху царквы выраслі маладыя бярозкі. Іх лісце аб нечым ціха шапоча, спрабуючы абудзіць наша сумленне. І сумна, з дакорам, з купалоў глядзяць анёлы і святыя ... Глядзяць на нас, сучаснікаў … .

Цікавасць і заклапочанасць выклікае яшчэ адзін архітэктурны помнік, які знаходзіцца на тэрыторыі Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Гэта Грудзінаўскі палаца-паркавы ансамбль – помнік архітэктуры позняга класіцызму. Ён размешчаны на ўсходняй ускраіне вёскі Грудзінаўка (былы маёнтак магілёўскага губернскага графа Д. Талстога). У комплекс уваходзяць палац з верандай і вялікім балконам на 2-м паверсе, парк з альтанкай, возера і некалькі гаспадарчых пабудоў [1, с. 37].

Палац пабудаваны ў пачатку XIX ст. з цэглы. У дэкоры фасадаў шырока выкарыстаны пілястры, сандрыкі рознай канфігурацыі, кранштэйны, нішы і інш. Нават на сённяшні дзень захавалася падлога, якая выкладзена керамічнай пліткай – выдатны ўзор беларускага барока – і цудоўнай работы фрэскі на столі, якія не змог знішчыць ні час, ні людская абыякасць. Перад верандай будынка знаходзіцца басейн з фантанамі, а калі быць дакладным, то тое, што ад яго засталося.




Грудзінаўскі палаца-паркавы ансамбль, вёска Грудзінаўка (фота аўтара)

Парк, які быў закладзены ў першай палове XIX ст., таксама ўяўляе сабой гістарычную каштоўнасць. У заходняй часцы парка – маляўнічае рукатворнае возера (старыя людзі расказвалі, што возера было выкапана рукамі сялян). Высаджаныя ў цэнтральнай частцы парка ліпавыя алеі звязваюць палац з возерам. У парку прадстаўлена звыш 40 відаў раслін, асобныя з якіх у Беларусі больш нідзе не сустракаюцца. Менавіта таму яшчэ ў 1963 г. парку быў прысвоены статут помніка прыроды і садова-паркавага мастацтва рэспубліканскага значэння. Дрэвы ў парку высаджаны літарамі «Х» і «Т» – так граф Харытон Талсты (былы гаспадар маёнтка) на стагоддзі захаваў свае ініцыялы. Парк ствараўся некалькімі пакаленнямі Талстых [5].




Каля знакамітага дуба ў парку (фота аўтара)

На жаль, сёння ўжо цяжка адшукаць «фамільныя літары», бо значная колькасць дрэў знішчана часам ці людзьмі. Выклікае захапленне адно дрэва – магутны дуб, які ўзняў да неба свае галіны, нібы рукі, быццам просячы дапамогі.

Увогуле, гісторыя палаца-паркавага ансамбля даволі багатая і цікавая. У 1772 г. пасля раздзелу Рэчы Паспалітай, імператрыца Кацярына ІІ падаравала графу Дзмітрыю Талстому маёнтак Грудзінаўка, які знаходзіўся за 40 вёрстаў ад Магілёва, побач з уезным горадам Быхавам. Продак грудзінаўскіх Талстых Пётр Андрэевіч быў адным з самых блізкіх саратнікаў цара Пятра І. Сярод уладальнікаў Грудзінаўкі былі баявыя генералы, героі Айчыннай вайны 1812 г. Ці не цікавы і багаты матэрыял для турыстычнай праграмы?! Пасля рэвалюцыі Талстыя пакінулі радзіму, графіня Аляксандра Рыгораўна, якая стала ўладальніцай маёнтка пасля смерці мужа, памерла ў Парыжы ў 1925 г. [4]. Багаты матэрыял пра сям'ю графа Талстога сабраў галоўны ўрач Рыжкаўскай бальніцы Грудзінаўскага сельсавета Кугель Калман Шмеркавіч (працаваў галоўным урачом з 1950 г. па 1997 г). Ён жа адшукаў патомкаў роду Талстых у Францыі. Дарэчы, Рыжкаўская бальніца была пабудавана ў 1899 г. на ўласныя сродкі Аляксандры Рыгораўны (знаходзілася на адлегласці 3 км ад Грудзінаўкі). На сённяшні дзень будынак бальніцы не захаваўся – вынік лёсу «выміраючых вёсак». У 1908 г. графіня Талстая садзейнічала будаўніцтву вінакурнага завода, у вытворчасці якога планавалася выкарыстоўваць плады графскага саду, але з віном нічога не атрымалася. Затое завод стаў вырабляць бульбяны спірт-сырэц. Будынак завода захаваўся, праўда, ужо некалькі гадоў завод не працуе.

Маёнтак, застаўшыся без гаспадароў, перажыў усе падзеі таго часу: рэвалюцыю, сусветную і грамадзянскую войны, калектывізацыю, Вялікую Айчынную вайну. Па чарзе тут размяшчаліся сярэдняя школа, дзіцячы сад, санаторый. У гады Вялікай Айчыннай вайны немцы выкарыстоўвалі палац у якасці шпіталю. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у маёнтку быў адкрыты дзіцячы дом. Пад яго дахам знайшлі прытулак 200 сірот, чые бацькі загінулі на фронце. У 1960 г. дзіцячы дом рэарганізавалі ў абласную школу-інтэрнат для дзяцей, хворых на рэўматызм [4]. Але зноў прыйшла бяда – грымнуў чарнобыльскі выбух. Узровень радыяцыі ў парку у шмат разоў перавысіў дапушчальную норму. Школу-інтэрнат закрылі. Пазней у спальным корпусе размясцілася местачковая бальніца. На сённяшні дзень у спальным корпусе адкрыты дом для састарэлых, тут знаходзяць прытулак адзінокія старыя людзі. А што тычыцца графскага палаца, то ён аказаўся нікому не патрэбным.

Сёння прыгажун-палац, які перажыў шмат ліхалеццяў, уяўляе сабой сумнае відовішча. Не ў лепшым стане знаходзіцца і стары парк.

Складваецца ўражанне, быццам ніхто не спрабуе штосьці зрабіць для аднаўлення графскага маёнтка. Але гэта не так. Спрабавалі. Шукалі спонсараў, нават знайшлі патомка Талстых, які прыязджаў у Грудзінаўку з Францыі.

Пахадзіўшы вакол палаца, ён сказаў, што не бача сэнсу «выкідваць грошы на вецер» [5]. У друку неаднойчы з'яўляліся артыкулы аб неабходнасці рэстаўрацыі палаца. У газеце «Савецкая Беларусія» былі надрукаваны артыкулы «Мародеры во дворце» (2001 г., аўтар К. Кугель), «Все помним, но ничему не научились» (2003 г., аўтар П. Мінчанка). Прыязджалі нават спецыялісты з Міністэрства культуры. Выказвалася меркаванне аб адкрыцці тут аздараўляльнага і культурнага цэнтра. Але, на жаль, на гэтым усё і спынілася. Сёння палац глядзіць на людзей пустымі, цёмнымі вокнамі, гінуць дрэвы, парк зарастае быллём. Можна, безумоўна, спісаць усё на эканамічныя цяжкасці нашага жыцця. Але тут узнікае іншае пытанне: ці даруюць нам нашы патомкі, што мы не змаглі захаваць для іх тое, што мелі? Таму, калі не заняцца выратаваннем палаца і парка сёння, то пройдзе яшчэ колькі часу і ратаваць будзе нечага. Горка назіраць, як на тваіх вачах адыходзіць у небыццё часцінка нашай гісторыі.

На пытанне, ці існуе сёння неабходнасць аховы і аднаўлення помнікаў архітэктуры, адказ толькі адзін – існуе. Людзі ўсё больш цікавяцца сваёй спадчынай, традыцыямі, культурай свайго народа. Фарміраванне любові да сваёй Айчыны пачынаецца з абуджэння цікавасці да мінулага сваёй «малой радзімы», да тых рэчаў, якія зроблены рукамі продкаў.

Будучыня любога грамадства, яго моц цалкам залежаць ад маральнага вобліку падрастаючага пакалення, яго патрыятызму, культуры. Як і царква ў вёсцы Сідаравічы Магілёўскага раёна, так і палаца-паркавы ансамль у вёсцы Грудзінаўка Быхаўскага раёна, замак Сапегаў у г. Быхаве, а таксама іншыя архітэктурныя збудаванні патрабуюць рэстаўрацыі, бо гэта ўнікальныя помнікі нашай гісторыі, накіраванай з мінулага ў будучыню.

Я ўпэўнена, што ўсім нам, беларусам, неабыякавы лёс нашых святынь, таму захоўваць і аберагаць іх павінны мы разам.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Памяць: Гістарычна-дакументальная хроніка Быхаўскага раёна / Беларус. Сав. Энцыкл.; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1990. – 576 с.

2. **Габрусь, Т. В.** З архітэктурнай спадчыны / Т. В. Габрусь // Памяць: Магілёўскі р-н: Гістарычна-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі / Укл. У. Ф. Агурцоў, М. П. Хобатаў. – Мінск, 1996. – С. 37.

3. Страчаная спадчына / Т. Габрусь [і інш.]. – Мінск: Полымя, 1998. – 354 с.

4. **Кугель, К.** Мародеры во дворце / К. Кугель // Советская Белоруссия. – 2001. – № 271. – С. 3.

5. **Минченко, П.** Все помним, но ничему не научились / П. Мариненко // Советская Белоруссия. – 2003. – № 12. – С. 5.